Источник: "Мінская праўда" - 2018-01-19

# Ад панскага маёнтка да «Сямі крыніц»





Парадны выгляд палацава-паркавага комплексу захаваў у сваім малюнку Напалеон Орда. Знешне палац па-ранейшаму глядзіцца велічна

**Чэрвеньскі лясгас пры дапамозе Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі распрацаваў тры маршруты па экалагічных сцежках свайго раёна і не толькі. Пераважна яны разлічаны на больш цёплую пару года. Але і ўзімку можна праехацца па некаторых аб'ектах. Што і зрабіла аўтар гэтых радкоў разам з намеснікам дырэктара Чэрвеньскага лясгаса па ідэалагічнай рабоце Жаннай Чарнавец, вадзіцелем Аляксандрам Русецкім і метадыстам па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея Станіславай Баркоўскай.**

Святлана АДАМОВІЧ

## Касцёл-прывід

Найцікавейшыя аб'екты размешчаны ў вёсцы Раванічы. Гэта пабудаваны ў 1799 годзе касцёл святога Антонія і палацава-паркавы комплекс Слатвінскіх – былая сядзіба другой паловы XIX стагоддзя. Дакладней, вандроўнікі знаёмяцца з тым, што засталося ад гэтых калісьці велічных будынкаў, узведзеных у звычайнай вёсцы – даволі глухой на той час мясцовасці, з густымі лясамі і процьмай драпежных жывёл.

Дэталёвае апісанне палацавага комплексу можна знайсці, напрыклад, у кнізе «Памяць. Чэрвеньскі раён». «У канцы XVIII стагоддзя каралеўскі маёнтак Раванічы стаў уласнасцю Сяхней-Слатвінскіх. Будаўніцтва сядзібы пачалося Антоніем Слатвінскім. У 1799 годзе быў пабудаваны касцёл Антонія як фамільная ўсыпальніца. Ён уяўляў сабой невялікі прамавугольны ў плане будынак з прамавугольнай апсідай, да якой прымыкаюць з двух бакоў сакрысціі. Галоўны фасад – чатырохкалонны порцік з трохвугольным франтонам і спрошчанымі іанічнымі капітэлямі з разеткамі ў выглядзе кветак. Аконныя праёмы прамавугольныя, інтэр'ер зальны. Падшыўная столь у выглядзе корабавага скляпення, на ёй захавалася паліхромная размалёўка на біблейскія тэмы. На сцяне – ілюзорная выява алтара. Над уваходам зроблены хоры з парапетам у выглядзе антаблемента. Касцёл – помнік архітэктуры класіцызму».



Фота аўтара

Касцёл-помнік архітэктуры класіцызму

На жаль, не разгледзець ужо размалёўкі на біблейскія тэмы на столі – даху няма… Як няма тых жа хораў, засталіся толькі прыступкі, якія вялі туды.

Кажуць, колькі гадоў таму ў пустым напаўразбураным будынку касцёла здарыўся пажар і сітуацыя з захаваннем рэштак яшчэ пагоршылася…

З адваротнага боку будынка знаходзіцца надмагілле з надпісам па-польску.

Настаўнікі мясцовай школы прыгадвалі, што па вёсцы доўга хадзілі легенды, быццам тут пахавана каханка некага са Слатвінскіх. Але потым сышліся на версіі, што гэта іх сваячка, якой было 18 год. Зрэшты, на помніку выразна пазначана, што дзяўчыне на момант зыходу з зямнога жыцця было 20.

На тэрыторыі касцёла можна заўважыць і іншыя надмагільныя камяні. І трэба пільна глядзець пад ногі, каб не наступіць на месца апошняга прытулку…

Так і хочацца штосьці зрабіць для ўшанавання іх памяці… Расчытаць надпісы, рэстаўраваць надмагіллі, хаця б прыбраць і абгарадзіць тое месца. Магчыма, зможа гэта зрабіць які моладзевы валанцёрскі лагер? Я б таксама паўдзельнічала…

## Рэшткі былой велічы

Далей едзем да палацава-паркавага комплексу, які знаходзіцца за некалькі соцень метраў ад касцёла, за прыгожым штучным возерам.

Парадны выгляд колішняга маёнтка захаваў у сваім малюнку Напалеон Орда. Менавіта дзякуючы яму мы ведаем, як выглядала мясцовасць у тыя часы.

Што ж вядома з афіцыйных крыніц пра палацава-паркавы комплекс Слатвінскіх? Будаўніцтва сядзібы працягнуў сын Антонія Слатвінскага Людвіг, на той час маршалак дваранства Мінскай губерні.

І зноў разгортваем кнігу «Памяць. Чэрвеньскі раён»: «Паводле інвентару 1804 года, сядзіба ўключала сядзібны дом, сад, сажалкі, сем агародаў, гадавальнік, аранжарэю, лядоўню. Меўся вялікі гаспадарчы двор: пякарня, сыраварня, малачарня, бровар, кузня, лазня, гумно, стайня».

Дарэчы, супрацоўнікі Чэрвеньскага лясгаса сцвярджаюць, што частка гэтай вытворчасці была размешчана на тэрыторыі сучаснага Дома паляўнічага, дзе захаваўся стары падмурак, які таксама зацікавіць аматараў даўніны.

Зараз рэшткі палаца абгароджаны драўляным плотам, месцамі паламаным. На фасадзе змешчана ахоўная дошка. Больш зручна падысці да былой сядзібы з боку возера, куды ад палаца вяла раней лесвіца. Вакол яе рэшткі дэкаратыўных слупкоў. Знешне палац па-ранейшаму глядзіцца велічна. Толькі калі не зазіраць унутр, куды праваліўся дах.

Парк у сезон прыбіраюць мясцовыя валанцёры. З даўніх часоў тут захаваліся дрэвы-экзоты: тсуга канадская, клён бліскатлівы, аксаміт амурскі ды іншыя. І нават быццам бы адзіныя ў краіне экзэмпляры дуба белага і клёна лжэплатанавага. Так што ў час зеляніны ў парку ёсць чым палюбавацца.

**Старажылы сцвярджалі, што ў часы панавання Слатвінскіх меўся падземны ход, які злучаў палац з касцёлам. І быццам бы на пачатку 70-х гадоў XX стагоддзя, калі ў будынку размяшчалася бальніца (з 1971 па 1973 год, а да гэтага з 1952 па 1971 год – Раваніцкая школа), хтосьці з падлеткаў знайшоў яго пачатак і нават прайшоў трохі. Але потым забаяўся. Ход практычна адразу ж заклалі. Словам, і афіцыйным даследчыкам даўніны тут ёсць дзе разгарнуцца.**

## Чаму ліставўніца іголачкі скідае?

Калі скарочаны маршрут пралягае па «Магілёўцы», для вандроўнікаў робяць прыпынак ля насаджэнняў ліставўніцы. Праўда, узімку голыя дрэвы нічога сабой не ўяўляюць. Затое можна пачуць цікавую легенду ад Станіславы Баркоўскай. І якраз пра зімовы перыяд!

«Вы ведаеце, чаму ліставўніца на зіму скідвае свае іголкі? – таямнічым голасам пачынае Станіслава Чаславаўна. – Кажуць, было так. Раслі побач кедр і ліставўніца. Апошняя ўвесь час выхвалялася: «Я такая стромкая, у мяне такія зялёныя іголачкі, мною ўсе любуюцца, я такая красуня!» А кедр толькі ціхенька дзівіўся і маўчаў. Аднойчы да іх выйшлі галодныя медзведзяняты. Вельмі яны есці хацелі. Кедр зжаліўся і скінуў ім свае арэшкі. Яны падсілкаваліся імі і пайшлі задаволеныя. А ліставўніцы так стала сорамна, што яна скінула ўсе свае іголачкі…»

На другі бок ад ліставўніц знаходзіцца месца адпачынку, абсталяванае Чэрвеньскім лясгасам. Тут можна падсілкавацца са сваіх запасаў і перадыхнуць.

## Святое месца і прыродны цуд

Па святую і лекавую ваду накіроўваемся да вёскі Крупа Бярэзінскага ўжо раёна. Хаця, кажуць у Чэрвеньскім лясгасе, даўней гэтая тэрыторыя належала Чэрвеньшчыне.

Для вандроўнікаў мясцовасць пад назвай «Сем крыніц» адкрываецца здалёк. Праз драўляны масток, праўда, не пераедзеш: шмат цяжкай тэхнікі сабралася на другім баку. Ад рабочых даведваемся, што тут мяркуюць зладзіць новы мост, а пакуль робяць аб'езд.

На ўваходзе – памятка наведвальнікам аб правілах паводзінаў.



– Гэта святое месца, – дадае Станіслава Баркоўская. – Таму і паводзіны павінны быць адпаведныя. Трэба зараней настройваць нашых вандроўнікаў на гэта. Кожны прыходзіць сюды са сваёй бядой, думкамі, надзеяй, хоча сам-насам пабыць з прыродай. Хтосьці змочвае вочы гаючай вадой, хтосьці п'е яе з кубка, іншыя акунаюцца ў купелі. Размовы тут лішнія. Здаецца, сама прырода прымушае сцішыцца, супыніцца, задумацца…

А месца сапраўды ўражвае. Справа ад сцежкі знаходзіцца драўляны крыж.

Тут растуць туі з Чэрвеньскага лясгаса. Памятных камянёў – два. І на іх можна прачытаць усю карысную інфармацыю.

Злева размешчана капліца з купеллю ў сярэдзіне. А само наваколле захоплівае нават узімку!

Сем крыніц (магічная нават лічба!) збіраюцца ў адзін ручай.

Тут таксама нагадваюць пра правілы паводзін. Пазначана, хто апякуецца над гэтым святым месцам. Папіўшы з кубка, канстатую: якая мяккая вада!!! Ні ў якое параўнанне не ідзе з нашай чэрвеньскай водаправоднай! Цікаўным можна даведацца з абвесткі, што ёсць і чаго няма ў гэтай вадзе.

Для ўсіх вернікаў наведванне «Сямі крыніц» – своеасаблівая паломніцкая вандроўка. А для няверуючых – сустрэча з прыродай, з цудам, з чысцінёй.

…І гэта толькі маленькая частка з запланаваных аб'ектаў. З нецярплівасцю чакаю пачатку веласіпеднага сезону, калі можна будзе запісацца ў Чэрвеньскім лясгасе на адну з экалагічных вандровак. І пабачыць апрача згаданага бабровую плаціну, панскі шлях, валун з магічнымі ўласцівасцямі, плюсавыя дрэвы сасны звычайнай, курганныя могільнікі ды іншае. ■